ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 12 (1010) ● ЧАЦВЕР, 12 красавіка 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXXVIII

## СЁННЯ—ДЗЕНЬ КАСМАНАЎТЫКІ І СУСВЕТНЫ ДЗЕНЬ АВІЯЦЫІ І КАСМАНАЎТЫКІ

*Палёт касмічнага карабля «Усход-1» з першым у свеце касманаўтам на борце адкрыў новую эру ў гісторыі сусветнай цывілізацыі. 12 красавіка — Дзень касманаўтыкі і Сусветны дзень авіяцыі і касманаўтыкі — адзначае ўсё чалавецтва.*

# ПА УНІВЕРСІТЭТУ

## Усесаюзная навуковая канферэнцыя

Усесаюзная навуковая канферэнцыя «Ленінскі план пабудовы сацыялізму і яго ажыццяўленне ў СССР», якая праводзіцца на базе нашага універсітэта, заканчвае сваю работу. Канферэнцыя прысвечана 50-годдзю апошніх артыкулаў, прамоў і пісьмаў У. І. Леніна. Працуе чатыры секцыі: палітэканоміі, навуковага камунізму, гісторыі КПСС і марксісцка-ленінскай філасофіі. Сярод удзельнікаў Мінскага форума вядомыя вучоныя Масквы, Ленінграда, Чэлябінска, Ташкента, Комі АССР, Чувашскай АССР і іншых гарадоў і рэспублік, прадстаўнікі вну Беларусі.

## У парткоме

НА ЧАРГОВЫМ пасяджэнні парткома разгледжаны наступныя пытанні: аб рабоце камсамольскіх арганізацый вучэбных груп на матэматычным факультэце (дакладчык т. Пекіна); аб рабоце партбюро філалагічнага факультэта па ідэйнаму выхаванню прафесарска-выкладчыцкага саставу (дакладчык т. Лойка); аб кіраўніцтве прафкомам палітыка-выхаваўчай работай у інтэрнатах (дакладчык т. Гарашчук); аб правядзенні справаздачна-выбарных сходаў у камсамольскіх арганізацыях груп, патокаў і курсаў (дакладчык т. Слука); аб правядзенні агляду мастацкай самадзейнасці (дакладчык т. Лысенка).

## Да юбілею СБА

20 красавіка пачне работу студэнцкая канферэнцыя, прысвечаная дзесяцігоддзю СБА Беларусі. На яе запрошаны госці з Калінінградскага, Гомельскага універсітэтаў, вну Мінска, прадстаўнікі Рэспубліканскага і Мінскага абласнога штабаў СБА.

У 14 гадзін у актавай зале галоўнага корпуса пачнецца пленарнае пасяджэнне, на якім будзе заслухан даклад «Студэнцкі будаўнічы атрад БДУ імя У. І. Леніна на будоўлях Радзімы» (дакладчык намеснік сакратара камітэта камсамола У. І. Сілін).

З 16 гадзін пачнуць работу секцыі:

1. Выхаваўчая роля СБА. Гісторыя СБА (старшыня кандыдат гістарычных навук У. Ф. Ладысеў) — 10 дакладаў.

2. Арганізацыйныя пытанні студэнцкіх будаўнічых атрадаў і ўмовы павышэння эканамічнай эфектыўнасці іх дзейнасці (старшыня кандыдат гістарычных навук, сакратар камітэта камсамола універсітэта А. Г. Слука) — 12 дакладаў.

3. Інтэрнацыянальныя студэнцкія будаўнічыя атрады — эфектыўная форма камуністычнага выхавання савецкіх і замежных студэнтаў (старшыня першы сакратар Кастрычніцкага РК ЛКСМБ У. А. Навумчык) — 6 дакладаў.

21 красавіка ўсе ўдзельнікі канферэнцыі выйдуць на камуністычны суботнік. А ў 18 гадзін таго ж дня адбудзецца вечар працоўнай славы.

## З ГІСТОРЫІ

У канцы XIX стагоддзя ў работах К. Э. Цыялкоўскага ўпершыню сталі аб'ектамі навуковых пошукаў думкі аб стварэнні апаратаў, здольных пераадольваць сілу зямнога прыцягнення, аб палёце ў космас. У 1903 годзе была апублікавана работа К. Э. Цыялкоўскага «Даследаванне Сусвету рэактыўнымі прыборамі». У ёй і ў наступных работах развіваецца тэорыя палёту ракеты, абгрунтоўваецца магчымасць тэхнічнага ажыццяўлення палётаў.

К. Э. Цыялкоўскі паставіў шэраг праблем, развіццё і вырашэнне якіх лягло ў аснову сучаснай касманаўтыкі.

●

Чэрвень 1932 г. У Маскве арганізавана «Група вывучэння рэактыўнага руху» (ГВРР), якая працавала пад кіраўніцтвам С. П. Каралёва. У 1933 годзе ГВРР ажыццявіла палёты першых вадкасных ракет. На базе газадынамічнай лабараторыі і ГВРР створан першы рэактыўны навукова-даследчы інстытут.

●

Пачатак касмічнай эры — 4 кастрычніка 1957 г., калі ў СССР быў ажыццёўлен запуск першага штучнага спадарожніка Зямлі.

●

У 1960—1961 гг. запушчана 5 караблёў-спадарожнікаў з мэтай падрыхтоўкі палёту чалавека ў касмічны прастор.

# ЗЯМЛЯ—СУСВЕТ

У 1961—1970 гг. на 16 пілатуемых караблях-спадарожніках ажыццявілі палёт 22 касманаўты.

●

Толькі ў СССР за 12 год выведзена на арбіты штучных спадарожнікаў Зямлі, Сонца, Месяца 483 станцыі пры вазе 1525 тон.

●

За 10 год — 31 касманаўт СССР і ЗША на 23 караблях ажыццявілі палёты.

●

Толькі да 1 мая 1970 года было запушчана 30 аўтаматычных міжпланетных станцый серый «Луна», «Венера», «Марс», «Зонд».

## ПЕРСПЕКТЫВЫ

Сярод першачарговых навуковых задач касманаўтыкі—даследаванне сучаснага стану Сонечнай сістэмы, яе паходжання, а таксама шэраг задач галактычнай і пазагалактычнай астраноміі: вывучэнне хімічнага саставу і фізічная характарыстыка атмасфер і паверхні планет і спадарожнікаў, разведка іх нетраў, удакладненне размераў і мас цел Сонечнай сістэмы...

●

У хуткім будучым павінны атрымаць шырокае развіццё запускі метэаралагічных штучных спадарожнікаў Зямлі. Гэта забяспечыць стварэнне сусветнай службы надвор'я. Стануць магчымымі акіянаграфічныя даследаванні: назіранні за рухам айсбергаў, цеплавых патокаў, нават за рухам касякоў рыбы...

●

Шырокія магчымасці і перспектывы мае прымяненне тэхнічных дасягненняў касманаўтыкі для чалавецтва непасрэдна ў развіцці ракетнага транспарту з новымі відамі касмічных рухавікоў, у стварэнні шырокай сеткі глабальнай сувязі з выкарыстаннем штучных спадарожнікаў Зямлі.

●

Рост насельніцтва і прагрэс у тэхніцы прывядуць да выхаду чалавека ў касмічную прастору. Рассяленне чалавецтва за межамі Зямлі, а потым і на ўсёй Сонечнай сістэме абумовіць развіццё індустрыі ў космасе.

К. Э. Цыялкоўскім быў распрацаван план такіх касмічных пасяленняў.

●

З дапамогай касманаўтыкі магчыма вырашэнне пытання аб паходжанні і развіцці жыцця. Выяўленне жыцця ў межах або за межамі Сонечнай сістэмы ў любой стадыі развіцця або хоць бы астаткаў жыцця дало б магчымасць глыбей падысці да рашэння праблемы...



Лекцыю «Аб магчымасці сувязі з пазазямнымі цывілізацыямі» для студэнтаў-фізікаў I курса чытае прафесар В. Г. Вафіядзі.

Фота Д. Чаховіча.



# ВЕСТКІ З ГІСТФАКА

Прайшоў партыйны сход з павесткай дня «Аб рабоце камсамольскай арганізацыі факультэта». На ім дадзена станоўчая ацэнка дзейнасці факультэцкай камсамоліі. Аднак адзначана зніжэнне вучэбнай дысцыпліны некаторых камсамольцаў. У пастанове запісана: заслухаць на бліжэйшых камсамольскіх сходах груп тых студэнтаў, якія пастаянна парушаюць дысцыпліну.

●

На мінулым тыдні адбылася нарада камсамольскага актыву факультэта. Яе ўдзельнікі абмяркавалі выкананне студэнтамі грамадскіх даручэнняў.

Часта бывае так, што ў аднаго студэнта некалькі пастаянных даручэнняў, у другога — ніводнага. У другой групе III курса аддзялення гісторыі (камсорг Таццяна Карпава) усе 30 чалавек маюць камсамольскія даручэнні. Нядрэнна абстаяць справы і на аддзяленні філасофіі (сакратар камсамольскай арганізацыі Ларыса Цітарэнка), дзе са 124 студэнтаў 100 чалавек маюць пастаянныя камсамольскія даручэнні.

Былі разгледжаны пытанні аб правядзенні Ленінскага заліку, распаўсюджанні латарэі Міжнароднага фестывалю студэнтаў.

●

Рэгулярна па сектарах праводзіцца вучоба камсамольскага актыву. У сераду адбыліся чарговыя заняткі актыву, дзейнасць якога накіравана цяпер на маючую адбыцца справаздачна-выбарную кампанію. Яна будзе праведзена 16—24 красавіка.

●

З нецярпеннем чакаюць да сябе ў госці студэнтаў IV курса аддзялення філасофіі — членаў лектарскай групы вучні школ №№ 4, 19, 21, 44, 52. Праводзімыя тут гутаркі на эстэтычныя тэмы аказваюць вялікі ўплыў на фарміраванне камуністычнай свядомасці навучэнцаў.

Толькі ў лютым у школах Мінска студэнтамі гістфака было прачытана 92 лекцыі.

Нядаўна адбылася чарговая сустрэча старшакласнікаў школы № 52 са студэнтамі.

Л. ЛЕВІТ.
(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).

# ПРАДМЕТ АБМЕРКАВАННЯ — СПЕЦСЕМІНАРЫ

На філалагічным факультэце адбылося чарговае пасяджэнне рэспубліканскага метадычнага аб'яднання выкладчыкаў беларускай літаратуры вну. На гэты раз было ўзнята пытанне аб ролі спецсемінара ў паглыбленым вывучэнні студэнтамі мастацкай літаратуры, літаратуразнаўчых і крытычных прац. Такая пастаноўка пытання непасрэдна вынікае з пастановы ЦК КПСС аб літаратурна-мастацкай крытыцы і мае важнае значэнне ў падрыхтоўцы студэнтаў да самастойнай навуковай працы.

Пасяджэнне адкрыў старшыня метадычнага аб'яднання, загадчык кафедры беларускай літаратуры педінстытута імя М. Горкага, прафесар А. А. Семяновіч.

З дакладам выступіў прафесар А. А. Лойка. Ён падрабязна азнаёміў прысутных з тэматыкай літсемінара па праблемах паэтыкі мастацкіх твораў, звярнуў асноўную ўвагу на важнасць асобных спецыфічных момантаў у яго правядзенні. Дакладчык вёў размову аб увядзенні ў спецсемінар больш паглыбленай тэматыкі для самастойнага рэферыравання.

Прафесар М. Р. Ларчанка і доктар філалагічных навук С. Х. Александровіч адзначылі, што задача спецсемінараў — навучыць студэнтаў самастойна аналізаваць літаратурныя творы і крытычныя працы, пісаць рэцэнзіі на кнігі.

Аб вопыце правядзення спецсемінараў па беларускай літаратуры расказалі загадчык кафедры беларускай літаратуры, дацэнт Гродзенскага педінстытута А. М. Пяткевіч, прафесар Гомельскага універсітэта М. М. Грынчык, дацэнт Брэсцкага педінстытута У. А. Калеснік. Яны аднадушна падтрымалі прапанову ўзняць ролю спецсемінараў у паглыбленні ведаў студэнтаў.

Дэкан філалагічнага факультэта Мінскага педінстытута, дацэнт кафедры беларускай літаратуры А. М. Налівайка звярнуў увагу на перагляд і выданне асобных праграм па літаратуры для педінстытутаў.

У прынятай пастанове адзначана, што для больш грунтоўнага авалодання навыкамі самастойнай працы неабходна шырэй прыцягваць студэнтаў да рэцэнзіравання новых мастацкіх твораў, літаратуразнаўчых і крытычных прац, а таксама напісання праблемных артыкулаў.

Звернута ўвага і на стварэнне новых метадычных распрацовак для спецсемінараў па літаратуры, а таксама на ўвядзенне спецсемінараў у педінстытутах.

**В. КАЛАДЗІНСКІ.**

## ● ПЕРАМОЖЦЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА

*Нядаўна на сходзе партыйна-гаспадарчага актыву рэктар БДУ прафесар У. М. Сікорскі ўручыў граматы і вымпелы пераможцам спаборніцтва ў гонар 50-годдзя ўтварэння СССР. Сярод узнагароджаных — калектыў кафедры біяхіміі, які ўзначальвае прафесар Анатоль Цімафеевіч ПІКУЛЕЎ.*

# ВЫПРАБАВАННЕ... НАВУКАЙ

Лепшы шлях пазнання — пешшу — вырашылі мы і адправіліся знаёміцца з кафедрай біяхіміі, лічачы паверхі да самага паднябесся ў высотным універсітэцкім корпусе. А можна было і не лічыць. Кафедра — на самым апошнім. Жыхары восьмага паверха не без іроніі жартуюць: самы высокі біяфак у свеце.

Так, сапраўды высока. Гэта стварае нямала перашкод і цяжкасцей, але невялікі калектыў — усяго восем супрацоўнікаў, шэсць з іх кандыдаты навук — умеюць іх пераадольваць. І, відаць, таму тут пануе нейкая дзіўная атмасфера няспыннай дзейнасці. Нават у час сесіі, калі ў лабараторыях непрывычнае зацішша — студэнты перасяліліся ў чытальныя залы бібліятэк, — жыццё не губляе зададзенага тэмпу. Экзамены, кансультацыі, зноў экзамены, пасяджэнні кафедры і навуковага семінара, распрацоўка спецкурсаў і метадычных пісем для завочнікаў, камандзіроўкі і работа па тэмах і яшчэ мноства клопатаў і спраў, якіх ніякімі пералікамі не ахопіш. І, канешне, найпершы клопат—студэнт, яго веды, яго навучанне на самым высокім навуковым узроўні. І таму рэгулярна наладжваюцца адкрытыя лекцыі і практычныя заняткі. Засвоеныя ў час навуковых даследаванняў методыкі ўводзяцца ў навучальны працэс і даюць студэнтам магчымасць адчуць смак сапраўднай работы для навукі.

А пакуль яны мучацца і радуюцца, падымаючыся па прыступках ведаў, мазгавы цэнтр кафедры думае над тым, што спатрэбіцца ім ужо заўтра, якімі навыкамі павінен валодаць будучы спецыяліст. І ад настаўніка да вучня ідзе эстафета здабытых ведаў. У гэтым годзе, напрыклад, уводзяцца заняткі па патахіміі абмену рэчываў, эндакрыналогіі, абнаўляецца малы практыкум. У час сесіі, каб кожны мог праверыць, наколькі ён гатоў да экзамена, дзейнічаў практыкум для самастойнай работы.

Наступны этап — практыка, і на кафедры загадзя прадугледжана ўсё, каб яна прайшла паспяхова. Плануецца гэты час так, каб студэнты набылі шырокі комплекс практычных навыкаў. На чацвёртым курсе яны павінны добра ведаць умовы вырошчвання лабараторных жывёл і іх асаблівасці, валодаць тэхнікай работы пры пастаноўцы біяхімічнага эксперыменту. На семінарах замацоўваюцца навыкі выдзялення субклетачных фракцый.

У праграму практыкі ўваходзіць знаёмства з новым абсталяваннем кафедры і авалоданне метадамі работы на ім.

Строга па графіку па суботах семінары, калёквіумы, кансультацыі. І ніякіх паблажак! Працоўны дзень студэнта з 8.30 да 15.30, а бывае, межы яго расцягваюцца, калі эксперымент не ўкладваецца ў намечаны тэрмін. Кіраўнік практыкі вядзе абавязковы кантроль студэнцкага добрасумлення. Гэтаму служаць і спецыяльны журнал, дзе фіксіруюцца вынікі работы, і студэнцкія дзённікі.

Але не толькі ў лабараторыях праходзіць дзень практыкантаў. У час экскурсій яны знаёмяцца з заводамі эндакрынных прэпаратаў і медпрэпаратаў, навукова-даследчымі інстытутамі АН БССР. Практыка прадугледжвае развіццё грамадска-палітычнай актыўнасці, і студэнты рыхтуюць палітгутаркі і папулярныя лекцыі для насельніцтва па розных раздзелах біяхіміі.

Спецыялізацыя пачынаецца з трэцяга курса, але дапытлівыя паяўляюцца тут значна раней. У лабараторыях можна сустрэць і выбіраючага сваю дарогу першакурсніка, і другакурсніка, які канчаткова вырашыў, што яго прызванне—біяхімія. Праўда, спачатку даручэнні ім даволі невялікія. Яны мыюць прабіркі, прэпарыруюць жывёл, прыглядаюцца да кафедры, а кафедра—да іх. Бывае, што выпрабаванне працай сёйтой не вытрымлівае, але тыя, хто застаецца, ужо самыя надзейныя і самыя моцныя.



Анатоль Цімафеевіч Пікулеў расказвае:

— Авансаў мы ніякіх не выдаем. Ведаюць, што будзе цяжка, але цікава.

Так яно і атрымліваецца. Уменне выкладчыкаў зацікавіць, накіраваць і падтрымаць у патрэбным рэчышчы агеньчык творчага пошуку прыносіць добры плён. Узяць хоць бы той факт, што 44 студэнты з 50, якія спецыялізуюцца па кафедры, удзельнічаюць у навукова-даследчай рабоце. Найбольш моцныя — па тых жа тэмах, што і асноўны састаў кафедры. І як вынік, толькі ў мінулым годзе дзевяць студэнтаў — аўтары і сааўтары апублікаваных навуковых прац, васемнаццаць — удзельнікі агляду-конкурсу. Сярод іх С. Слугіна, Т. Міцюкова, Т. Сяргеенка, Л. Малалеткіна, А. Трухан, Г. Баўрына, В. Чыжова і іншыя. Пятнаццаць з васемнаццаці работ ацэнены вышэйшай катэгорыяй. Годам раней усе 12 студэнтаў, якія ўдзельнічалі ў аглядзе, дабіліся поспеху. Восем работ былі аднесены да І катэгорыі, тры— да ІІ, адной прысуджана рэспубліканская прэмія. З 20 дыпломных работ мінулага года 17 заслужылі выдатную ацэнку і тры—добрую.

Неяк у гутарцы з аспірантам Мішам Шолухам бліснуў, мне здаецца, адзін з залатых ключыкаў, якімі адкрываюцца запаветныя дзверы ў навуку:

— Шэф умее так выступіць у гуртку, так паверне праблему, так паставіць задачу, што на наступны дзень у лабараторыю не ўціснешся з-за студэнтаў.

— Ну, а сам як прыйшоў на кафедру?

— Сагітаваў Уладзімір Міхайлавіч Чарнагузаў. Быў ён тады з намі на бульбе...

— Цяжка прыходзіцца?

— Бывае. Асабліва выматваешся летам, калі працуеш з жывёламі. Часта эксперымент зацягваецца, і з лабараторыі не выходзіш па 10—12 гадзін. У мінулым годзе пахудзеў так, што адны косці засталіся, давялося набіраць норму.

Міхаіла хваляць: надзвычай працавіты, спадзяюцца, што з тэмай справіцца паспяхова.

Вось так добры вірус сур'ёзнай навуковай зацікаўленасці выкладчыцкага калектыву не можа мінуць студэнтаў. На іх жа вачах і сам прафесар А. Ц. Пікулеў, і дацэнты І. П. Хрыпчанка, М. Ф Кукулянская, выкладчыкі У. М. Чарнагузаў, С. М. Мохарава і іншыя не толькі чытаюць лекцыі, вядуць практычныя, удзельнічаюць у навуковым гуртку, клапоцяцца аб вячэрніках і завочніках, распрацоўваючы для іх метадычныя пісьмы і праграмы, але і плённа працуюць кожны над сваім раздзелам навукова-даследчай тэмы кафедры.

Цяпер навуковая праца калектыву канцэнтруецца на чатырох тэмах. Адна з іх выконваецца ў садружнасці з інстытутам медыка-біялагічных праблем Міністэрства аховы здароўя СССР.

Строгае планаванне ўсіх этапаў навуковай працы, арганічная ўзаемасувязь канкрэтных даследаванняў не раз адзначаліся як станоўчыя моманты ў вопыце работы кафедры. І гэты вопыт мае стройнае прадаўжэнне. Штоквартальна на пасяджэнні абмяркоўваюцца атрыманыя вынікі, абагульняюцца даныя, удакладняюцца метадычныя пытанні, сумесна выпрацоўваецца схема правядзення эксперыменту.

І яшчэ характэрная рыса, якая адразу ж кідаецца ў вочы, — дзелавітасць. Яна праяўляецца ва ўсім. І там, дзе гутарка ідзе аб напрамку навуковых пошукаў, і ў менш значных, але не менш важных справах — парадку ў лабараторыях, расходаванні рэактываў, дысцыпліне працы.

Бадай, нельга абысці і патрабавальнасць: да студэнтаў, адзін да другога, падпарадкаванне ўсіх інтарэсаў агульнай справе. А яна патрабуе ініцыятывы, умення і жадання працаваць з поўнай аддачай.

Калі ўвесь універсітэт рыхтаваўся практычнымі справамі адзначыць 50-годдзе садружнасці саюзных рэспублік, на кафедры распрацавалі канкрэтны план свайго ўдзелу ў перадюбілейным спаборніцтве. Намечана было напісаць пяць няпланавых артыкулаў і адрэдагаваць зборнік «Біяхімія», асвоіць новыя метады статыстычнай апрацоўкі вынікаў даследаванняў, перагледзець пералік спецкурсаў і яшчэ цэлы шэраг пунктаў.

Уручэнне граматы і вымпела пераможцы спаборніцтва гаворыць аб тым, што абавязацельствы з гонарам выкананы.

Калі паспрабаваць аб некаторых выніках мінулага года расказаць мовай лічбаў, то ў 1972 годзе супрацоўнікі і студэнты апублікавалі ў савецкіх і замежных часопісах 16 артыкулаў, 19 тэзісаў, зроблена 20 дакладаў на дзевяці ўсесаюзных рэспубліканскіх і ўнутрывузаўскіх канферэнцыях, прачытана 21 лекцыя для насельніцтва.

Цікава прасачыць маршруты навуковых паездак выкладчыкаў і студэнтаў: Адэса — міжвузаўская канферэнцыя; Калуга — IV Усесаюзная канферэнцыя па касмічнай біялогіі і авіякасмічнай медыцыне; Ленінград — VI Усесаюзная канферэнцыя па нейрахіміі; Алма-Ата — сімпозіум па тканевай радыёадчувальнасці; Істра, зноў Ленінград, Мінск... Рэха гэтых форумаў адгукаецца ў студэнцкіх аўдыторыях, калі ўражанні аб паездках дакладваюцца ў гуртку ці на пасяджэнні. І растуць студэнты, фарміруюцца даследчыкі.

Напэўна, лепшая атэстацыя — высокі аўтарытэт кафедры. Яе выпускнікоў ахвотна запрашаюць на працу ў навукова-даследчыя ўстановы. Іх можна сустрэць ва Усесаюзным біялагічным цэнтры ў Пушчыне. Двое — Наташа Калеснікава і Дзмітрый Санько, выпускнікі 1971 г. — паспяхова вытрымалі экзамен, прайшлі конкурс і цяпер вучацца ў аспірантуры Інстытута прыродных злучэнняў АН СССР. Ды і ў саставе кафедры многа яе былых выхаванцаў.

Амаль дзесяць год узначальвае калектыў Анатоль Цімафеевіч Пікулеў. Ва універсітэце яго ведаюць як аўтарытэтнага вучонага, нястомнага грамадскага дзеяча, умелага арганізатара, а ў калектыве плюс да ўсяго цэняць дабрату і тактоўнасць, такія неабходныя ў чалавечых узаемаадносінах і, напэўна, стымулюючыя працоўныя поспехі. Пацвярджэнне гэтаму — вопыт кафедры.

**А. АЛЕНІЧ.**





**На здымках:** (уверсе) студэнт V курса **С. Усанаў** працуе на кафедры біяхіміі над эксперыментальнай часткай дыпломнай работы; (унізе) пасяджэнне кафедры.

Фота **Д. Чаховіча.**



# ВЫНІК ВЯЛІКАЙ ПРАЦЫ

У мінулым годзе выйшла з друку і паступіла ў продаж кніга «Якасная ацэнка зямель у калгасах і саўгасах БССР». 7700 экземпляраў хутка зніклі з прылаўкаў. А ў снежні 1972 г. па рашэнню вучонага савета сельскагаспадарчай Акадэміі імя Ціміразева аўтарам кнігі — А. Р. Мядзведзеву, Л. М. Суроваму, Г. М. Окруту, В. С. Жмака — была прысуджана прэмія В. Р. Вільямса. Гэтая прэмія прысуджаецца ў галіне глебазнаўства раз у чатыры гады. Яна — сведчанне высокай ацэнкі шматгадовай работы беларускіх вучоных.

— Даследаванні па баніціроўцы — якаснай ацэнцы глебы — вядуцца ў Савецкім Саюзе з 1955 года,— расказвае адзін з лаўрэатаў прэміі, член-карэспандэнт АН БССР, доктар сельскагаспадарчых навук, загадчык кафедры глебазнаўства БДУ Андрэй Рыгоравіч Мядзведзеў. — У апошні час гэтая праблема набывае асаблівую важнасць. Беларусь — першая рэспубліка, у якой завершан першы тур баніціроўкі глебы кожнага калгаса і саўгаса.

Гэтая кніга — вынік пяцігадовай працы вялікай групы вучоных, супрацоўнікаў нашай кафедры, Інстытута глебазнаўства і аграхіміі, Белгіпразема. Практычны матэрыял пачалі збіраць у 1961—64 гг. Глебавы атрад пабываў у кожным раёне, кожным калгасе і саўгасе. Глебы ацэньваліся па спецыяльна распрацаванай шкале. Давалася падрабязная характарыстыка сенажацям, пасяўным плошчам, лугам кожнай гаспадаркі.

Даследчая работа, якую правялі беларускія глебазнаўцы, ужо мае практычнае прымяненне. План паставак сельскагаспадарчай прадукцыі дзяржаве для калгасаў і саўгасаў будуецца з улікам табліц баніціроўкі; іх выкарыстоўваюць таксама ў сваёй вытворчай дзейнасці калгасы і саўгасы.

Да 1976 года, пачатку дзесятай пяцігодкі, неабходна ўстанавіць новыя нормы паставак на пяцігодку развіцця народнай гаспадаркі. У Беларусі пачынаецца другі тур ацэнкі глебы з улікам паляпшэння зямель за кошт угнаенняў.

Такім чынам, выхад у свет кніжкі — гэта не канец вялікай работы.

Працягваецца творчае супрацоўніцтва беларускіх глебазнаўцаў, працягваюцца даследаванні і распрацоўкі ў гэтай важнай галіне.

**Л. АРЛОВА.**

# АТРАДЫ СФАРМІРАВАНЫ

Падрыхтоўку да новага працоўнага семестра мы пачалі яшчэ ў лістападзе мінулага года. У той час ужо быў створан штаб працоўных спраў, у які ўвайшло шэсць найбольш актыўных студэнтаў. Значнае месца ў падрыхтоўчы перыяд мы адводзілі нагляднай агітацыі: насценгазетам, плакатам і г. д.

Цяпер на факультэце сфарміравана пяць студэнцкіх будаўнічых атрадаў. З ліку найбольш вопытных студэнтаў падабраны камандзіры і камісары. На пасяджэнні камітэта камсамола зацверджаны спісы членаў атрадаў. Усяго ў трэцім працоўным семестры 1973 года прымуць удзел больш 230 студэнтаў — амаль кожны чацвёрты камсамолец факультэта. Яны будуць працаваць на Урале, у Сібіры, Крыме, Беларусі.

У цяперашні час галоўную ўвагу мы ўдзяляем праходжанню членамі атрадаў медыцынскага агляду, вучобе па тэхніцы бяспекі.

**М. ПАДДУБНЫ,**
**начальнік штаба працоўных спраў юрыдычнага факультэта.**

# Да 150-годдзя з дня нараджэння А. М. Астроўскага

● *З нагоды юбілею вялікага рускага драматурга на філалагічным факультэце ўчора прайшла навуковая студэнцкая канферэнцыя. З дакладам на ёй выступіў дацэнт П. І. Ткачоў. Пяць студэнцкіх паведамленняў былі прысвечаны літаратурнай спадчыне А. М. Астроўскага.*

*Пасля канферэнцыі быў паказан фільм-спектакль «Ваўкі і авечкі».*

● *На кафедры рускай класічнай літаратуры арганізавана кніжная выстаўка да юбілею А. М. Астроўскага.*

● *Выкладчыкі філалагічнага факультэта выступалі з дакладамі і гутаркамі не толькі ў студэнцкіх групах, але і ў многіх школах рэспублікі.*

## СТВАРАЛЬНІК РУСКАГА ТЭАТРА

Трэцяга снежня 1849 года на кватэры вядомага ў той час літаратара, гісторыка і рэдактара часопіса «Масквіцянін» М. П. Пагодзіна сабраліся маскоўскія пісьменнікі, журналісты, артысты. Сярод іх — М. В. Гогаль. Усе госці стоўпіліся ля славутага сатырыка, і ніхто не звяртаў увагі на маладога, вельмі сарамлівага чалавека, нават знешні выгляд якога сведчыў, што ён хвалюецца. І было чаго хвалявацца— усе масцітыя літаратары, акцёры сышліся сюды, каб праслухаць яго, Астроўскага, п'есу. Што яны скажуць? Які будзе прысуд?

Праўда, ён не навічок у літаратуры. Сёе-тое напісана: аповесці «Як квартальны наглядчык пускаўся ў скокі», «Запісы замаскварэцкага жыхара», камедыя «Карціна сямейнага шчасця», але створаны (Астроўскі сам адчуваў гэта) яны пад уплывам гогалеўскіх твораў.

Новая п'еса «Свае людзі — паладзім» («Банкрут») — зусім іншая справа. Тут усё сваё — свая тэма, сваё адлюстраванне жыцця, нарэшце, свае, нікім не апісаныя дагэтуль героі... З дзіцячых год (нарадзіўся 12.IV.1823 г.) ён сустракаўся з маскоўскімі купцамі, да таго ж бацька яго меў адвакацкую практыку сярод маскоўскага купецтва, ды і сам аўтар служыў у судзе, дзе разглядаліся фінансавыя справы.

Тады, 3 снежня 1849 года, госці М. П. Пагодзіна наўрад ці здагадваліся, што прысутнічаюць пры нараджэнні вялікага драматурга, якому суджана было стварыць (у поўным сэнсе гэтага слова) рускі нацыянальны тэатр.

На жаль, мы не ведаем дакладна, як ацаніў п'есу маладога аўтара М. В. Гогаль. Можам толькі меркаваць: ацэнка была станоўчай, бо нездарма ж п'есу надрукавалі ў сакавіцкай кніжцы «Масквіцяніна» за 1850 год. Яе цёпла сустрэлі прагрэсіўныя колы тагачаснай Расіі. «Ваш «Банкрут», — пісаў драматургу А. Ф. Пісемскі, — купецкае «Гора ад розуму» або, дакладней сказаць, купецкія «Мёртвыя душы». Другі пісьменнік, У. Ф. Адоеўскі, падкрэсліў: «Я лічу на Русі тры трагедыі: «Недаростак», «Гора ад розуму», «Рэвізор». На «Банкруце» я стаўлю нумар чатыры». Былі і іншыя водгукі — афіцыйныя. А. М. Астроўскаму і М. П. Пагодзіну давялося вытрымаць даволі жорсткі паядынак з царскай цэнзурай і выйграць яго.

Пасля таго, як п'еса была надрукавана, А. М. Астроўскі вырашыў паспрабаваць дабіцца дазволу паставіць яе на сцэне. Твор трапіў у рукі цара Мікалая І. Царская рэзалюцыя была кароткай і яснай: «Дарэмна надрукавана, іграць жа забараніць».

Паўстае пытанне: чаму забараніць? Тэма яе — жыццё купецтва, барацьба з драпежніцтвам, самадурствам, эгаізмам. І калі твор дапамагае змагацца з такімі адмоўнымі з'явамі, дык яго трэба толькі вітаць. Але не будзем рабіць высновы з пазіцый нашай рэчаіснасці. Улічым акалічнасці таго часу. Руская буржуазія была адной з апор (і даволі моцнай), на якіх трымаўся царызм. Выкрываючы адмоўныя бакі купецтва, аўтар расхістваў асновы царскай улады. Да таго ж, у вочы кідалася аналогія: купецкі самадур Бальшоў і расійскі самадур Мікалай І. Драматург нібы падказваў: вытокі самадурства, драпежніцтва і другіх падобных з'яў трэба шукаць у палітычным і эканамічным ладзе Расіі — у гэтым і была ідэйная накіраванасць п'есы «Свае людзі — паладзім», дакладней кажучы, так яе разумелі сучаснікі А. М. Астроўскага.

П'еса «Свае людзі — паладзім» з'явілася прычынай таго, што за драматургам устанавілі нягласны паліцэйскі нагляд. Давялося кінуць службу ў судзе і перайсці на нялёгкі хлеб расійскага літаратара. Ён многа працуе: адна за другой паяўляюцца ў друку яго драматычныя творы «Бедная нявеста» (1852 г.), «Не ў свае сані не сядай» (1853 г.), «Беднасць не загана» (1854 г.)...

«Ён пачаў незвычайна, — пісаў пра А. М. Астроўскага І. С. Тургенеў у артыкуле «Некалькі слоў аб новай камедыі А. М. Астроўскага «Бедная нявеста», — і чытач чакае ад яго незвычайнага».

Незвычайна... Гэта сапраўды так, бо А. М. Астроўскі з'явіўся заснавальнікам у рускай літаратуры камедыі новага стылю — маральна-выкрывальнай.

А мы павінны адзначыць і другое. Сувязі Астроўскага з рэакцыйна-славянафільскім асяроддзем, якое групавалася вакол часопіса «Масквіцянін», сама рэакцыйная атмасфера таго часу паклала адбітак на ідэйныя пазіцыі драматурга, што, вядома, адбілася і на яго эстэтычных поглядах.

Перадавая літаратура, прадстаўнікі рэвалюцыйнай дэмакратыі вялі бескампрамісную барацьбу з уплывам на Астроўскага шкодных рэакцыйна - славянафільскіх ідэй. Так, напрыклад, М. Г. Чарнышэўскі ў артыкуле, прысвечаным камедыі «Беднасць не загана», адзначаючы станоўчае ў творчасці драматурга, даволі рэзка крытыкаваў ідэйную накіраванасць п'есы і заклікаў Астроўскага адмовіцца ад «ідэалізацыі застарэлых форм». Трэба аддаць належнае рускім рэвалюцыянерам-дэмакратам: іх выступленні (часам і занадта рэзкія) прасякнуты глыбокай верай у тое, што «прымірэнне з рэчаіснасцю» драматурга, захапленне ім славянафільскімі ідэямі мае кароткачасовы характар, што надыдзе час, і сам драматург, як пісаў М. А. Някрасаў, «здзівіцца, што зробяць яго сілы, калі ён дасць ім поўны прастор і свабоду».

Надыходзіў 1855 год, які стаў паваротным у творчасці А. М. Астроўскага. Аб гэтым сведчылі новыя камедыі «З чужога шалу галава круціцца», камедыя «Выхаванка» і іншыя творы, у якіх мы назіраем адмаўленне і сцвярджэнне. Бязлітасная барацьба з царствам самадураў, выкрыванне яго цёмных бакоў, супрацьпастаўленне самадурам станоўчых герояў — людзей беспакойных, рашучых — гэта становіцца дэвізам усяго далейшага творчага жыцця вялікага драматурга.

Асобае месца ў спадчыне А. М. Астроўскага займае п'еса «Навальніца» (1859 г.). Перад намі праходзяць рэзка акрэсленыя пяром мастака сацыяльныя тыпы самадураў. Дзікой, Кабаніха і іншыя, жорсткія, дэспатычныя, яны гатовы растаптаць усё светлае, радаснае, каб толькі яно не закранала іх спакою. На фоне «цёмнага царства» няскораная, гордая Кацярына — «прамень святла ў цёмным царстве» дэспатаў, драпежнікаў, самадураў. Ідэйная накіраванасць вобраза Кацярыны не толькі ў тым, што яна кідае выклік самадурам, але і ў тым (і гэта самае галоўнае), што гэты вобраз абвяшчае пачатак канца «цёмнага царства». Такой менавіта і бачыў Кацярыну рэвалюцыйны дэмакрат М. А. Дабралюбаў, такой яе бачыць наша сучаснае пакаленне.

Міналі гады. Паяўляліся новыя глыбока народныя па сваёй сутнасці п'есы — «За чым пойдзеш, тое і знойдзеш» (1861), «На бойкім месцы» (1865), «Не ўсё кату масленіца» (1871), «Праўда добра, а шчасце лепш» (1877)... За сваё творчае жыццё А. М. Астроўскі стварыў 47 арыгінальных п'ес, 7 напісаў разам з іншымі літаратарамі і пераклаў з замежных моў больш як 20 драматычных твораў.

Яшчэ ў 1882 годзе І. А. Ганчароў пісаў А. М. Астроўскаму: «Вы адзін дабудавалі будынак, у аснову якога паклалі краевугольныя камяні Фанвізін, Грыбаедаў, Гогаль... Толькі пасля Вас мы, рускія, можам з гонарам сказаць: «У нас ёсць свой, рускі, нацыянальны тэатр»... Вітаю Вас як бессмяротнага творцу бясконцага раду паэтычных тварэнняў... дзе мы ўвачавідкі бачым і чуем спрадвечнае, сапраўды рускае жыццё...»

Беларускі глядач пазнаёміўся з асобнымі творамі А. М. Астроўскага яшчэ ў 60-х гадах XIX стагоддзя. Так, у 1865 г. на сцэне Мінскага тэатра была пастаўлена «Навальніца».

Але толькі ў гады Савецкай улады п'есы вялікага рускага драматурга сталі неад'емнай часткай рэпертуару беларускіх тэатраў. У розны час на сцэне тэатра імя Я. Купалы ішлі п'есы «Ваўкі і авечкі» (1936 г.), «Позняе каханне» (1944 г.), «Таленты і паклоннікі» (1950 г.), «Даходнае месца» (1953 г.), «На ўсякага мудраца хапае прастаты» (1962 г.)...

Большасць твораў вялікага драматурга вытрымала выпрабаванне часам. Яго п'есы ідуць не толькі на сцэнах тэатраў нашай Радзімы, але і на тэатральных сцэнах многіх замежных краін. Рускі драматург стаў драматургам свету.

**П. ТКАЧОЎ,**
**загадчык кафедры рускай класічнай літаратуры, дацэнт.**

# ПАЛАЖЭННЕ АБ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ СПАБОРНІЦТВЕ ЛІНЕЙНЫХ БУДАЎНІЧЫХ АТРАДАЎ

Студэнцкія будаўнічыя атрады з'яўляюцца эфектыўнай формай камуністычнага, працоўнага і маральнага выхавання студэнцкай моладзі.

Выконваючы пастанову ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР, ВЦСПС, ЦК ВЛКСМ «Аб разгортванні сацыялістычнага спаборніцтва работнікаў прамысловасці, будаўніцтва і транспарту за датэрміновае выкананне народнагаспадарчага плана на 1973 год», студэнцкія будаўнічыя атрады універсітэта уключаюцца ў сацыялістычнае спаборніцтва, закліканае павысіць якасную падрыхтоўку, арганізаванасць СБА, забяспечыць высокі ўзровень палітыка-выхаваўчай работы, эканамічную эфектыўнасць і якасць выконваемых работ, выхаванне моладзі на слаўных рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях савецкага народа.

### УМОВЫ КОНКУРСУ

І. У спаборніцтве, прысвечаным 50-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна, прымаюць удзел усе лінейныя СБА універсітэта.

ІІ. Спаборніцтвы падраздзяляюцца на два этапы:

а) падрыхтоўчы этап (снежань 1972 г. — чэрвень 1973 г.);

б) рабочы этап (чэрвень—жнівень 1973 г.).

### ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ

1. Вынікі сацспаборніцтва падводзяцца:

І этап — падрыхтоўчы— да 20 чэрвеня 1973 г.

ІІ этап — рабочы — да 15 верасня 1973 г.

2. Асноўнымі крытэрыямі пры падвядзенні вынікаў па першаму этапу служаць своечасовае і якаснае

а) камплектаванне СБА;

б) заключэнне дагавораў з будаўнічымі арганізацыямі;

в) афармленне ўсёй неабходнай дакументацыі;

г) своечасовае праходжанне медагляду, правядзенне заняткаў па тэхніцы бяспекі, вучоба па спецыяльнасці, вучоба піянерважатых, лектараў, карэспандэнтаў;

д) наяўнасць агітбрыгады ў атрадах, лектарскай групы і матэрыялаў для выступленняў, матэрыялаў для афармлення ленінскіх куткоў атрадаў, спартыўнага інвентару;

е) своечасовае і якаснае правядзенне працоўнага дэсанта.

3. Асноўнымі крытэрыямі па другому этапу служаць:

а) выкананне ўсіх умоў першага этапу сацспаборніцтва;

б) выкананне вытворчай праграмы атрада, якасць выкананых работ;

в) строгае падтрыманне ўсімі байцамі атрада Статута СБА, патрабаванняў ТБ, адсутнасць вытворчага і бытавога траўматызму;

г) пастаноўка шэфскай, ваенна-патрыятычнай і спартыўна-масавай работы;

д) арганізацыя і правядзенне нядзельнікаў;

е) работа з цяжкавыхоўваемымі;

з) якасць падрыхтоўкі і правядзенне грамадска-палітычнай атэстацыі ў атрадзе.

4. Атрады, якія дапусцілі грубыя парушэнні Статута УСБА і правіл тэхнікі бяспекі, ад удзелу ў спаборніцтве адхіляюцца.

### УЗНАГАРОДЖАННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ

1. Студэнцкія будаўнічыя атрады, якія занялі першыя месцы ў падрыхтоўчы перыяд, узнагароджваюцца граматамі і вымпеламі.

2. Атрады, якія занялі тры першыя месцы па выніках двух этапаў, узнагароджваюцца:

І месца—пераходным сцягам і паездкай у Брэсцкую крэпасць.

ІІ месца—Ганаровай граматай БДУ.

ІІІ месца—граматай БДУ.

**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА.**
**ШТАБ ПРАЦОЎНЫХ СПРАЎ.**



*Купалаўскай «Паўлінцы» споўнілася 60 год.*

*Нядаўна ў Літаратурным музеі імя Я. Купалы адбыўся вечар сустрэчы з выканаўцамі ролі Паўлінкі трох пакаленняў —П. В. Мядзелка, народнай артысткай БССР Р. М. Кашэльнікавай і А. Доўгай.*

*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*






## СПАБОРНІЧАЮЦЬ ГРАЦЫІ

У спартыўнай зале БПІ прайшло першынство Белсавета СДСТ «Буравеснік» па мастацкай гімнастыцы. Наш універсітэт на гэтых спаборніцтвах прадстаўлялі майстры спорту Ларыса Вараб'ёва, Іра Рогач, Ніна Гарбунова, Алена Цярохіна і кандыдаты ў майстры Іра Рабцэвіч, Ала Лазарэвіч і Таццяна Падбярозкіна.

Іх паспяховыя выступленні на папярэдніх спаборніцтвах падавалі надзею на прызавое месца. Для гэтага трэба было перамагчы моцныя каманды БПІ, БІНГ, а таксама неаднаразовую пераможцу такіх спаборніцтваў — каманду МПІ.

Аднак і на гэты раз каманда педагагічнага інстытута аказалася мацнейшай, хоць перамога і дасталася ёй у цяжкай барацьбе з нэшымі дзяўчатамі. Такім чынам, каманда БДУ, прайграўшы лідэру толькі 5 ачкоў, заняла другое месца.

Хочацца адзначыць спартыўны характар нашых дзяўчат, якія праявілі выключную настойлівасць у барацьбе за прызавое месца, а таксама поспех Л. Вараб'ёвай, якая заняла другое месцэ ў вольнай праграме.

Упэўнена выступаюць у гэтым сезоне Н. Гарбунова і І. Рогач. Гэтыя спартсменкі ўключаны ў састаў зборнай Беларускага савета СДСТ «Буравеснік», акрамя таго, Л. Вараб'ёва і Н. Гарбунова ўключаны ў зборную каманду БССР.

Безумоўна, вялікая заслуга ў паспяховым выступленні нашых гімнастак і іх трэнера Валянціны Васільеўны Сеўба.

**Наш кар.**

## НА БАРЦОЎСКІХ ДЫВАНАХ

Два дні ў спартыўнай зале юрфака праходзіла першынство БДУ па класічнай барацьбе. У напружаных паядынках мацнейшай паказала сябе каманда фізічнага факультэта, якая ўжо на працягу многіх год не ўступае пальмы першынства. Сюрпрызам для ўсіх з'явілася другое месца каманды ФПМ: у мінулым годзе яна заняла толькі шостае месца. Трэцяе месца дасталася камандзе матфака. Наступныя — камандам хімфака, філфака, гістфака, геафака, журфака, юрфака і біяфака.

Вельмі цікава праходзіла барацьба ў асабістым заліку. Часта здаралася, што барцы, прайграўшы адну схватку, знаходзілі сілы і змагаліся да канца і нават станавіліся чэмпіёнамі. Упэўненую перамогу ў вазе да 52 кг атрымаў кандыдат у майстры спорту, сярэбраны прызёр усесаюзных студэнцкіх гульняў А. Канаў. У вазе да 57 кг, прайграўшы спачатку адну сустрэчу, а пасля перамогшы астатніх сапернікаў, стаў чэмпіёнам студэнт ФПМ А. Сянько. Далей у парадку вагавых катэгорый дабіліся поспеху: да 62 кг—А. Соцкі (фізфак), да 68 кг — Л. Крышталевіч (гістфак), да 74 кг — Ф. Ванькові (геафак), да 82 кг — А. Данілевіч (юрфак), да 90 кг — В. Панарадаў (фізфак). Прыемна адзначыць перамогу кандыдата фізіка-матэматычных навук А. Антаневіча ў вазе да 100 кг і яго спартыўнае даўгалецце. У вазе звыш 100 кг перамог студэнт матфака майстар спорту Е. Козін.

Класічная барацьба ва універсітэце карыстаецца асаблівай папулярнасцю. І невыпадкова. Каманда БДУ з'яўляецца адной з мацнейшых у рэспубліцы. У секцыях і групах удасканалення займаюцца каля 400 чалавек. Аднак зала барацьбы ў галоўным корпусе змяшчае толькі 15—20 чалавек, і даводзіцца праводзіць трэніроўкі ў перапоўненай зале з парушэннем іх рэжыму і графіка.

Многа разоў узнімалася пытанне аб тым, што займацца барацьбой у такіх умовах шкодна для здароўя. Выйсцем магло б паслужыць выкарыстанне спартыўнай залы юрыдычнага корпуса, у якой не праводзяцца вучэбныя заняткі.

* * *

Сталі вядомы вынікі першынства БДУ па вольнай барацьбе. Месцы сярод каманд размеркаваліся наступным чынам: I—хімфак, II—матфак, III — фізфак, IV—ФПМ, V—гістфак, VI — юрфак, VII — журфак, VIII — геафак, IX — біяфак.

У асабістым заліку чэмпіёнамі БДУ сталі Нгуен Нгок Нгуе (матфак), П. Брылеўскі (гістфак), А. Гудзін (хімфак), В. Макарэвіч (ФПМ), А. Еўсіевіч (матфак) А. Шчолакаў (хімфак), А. Навіцкі (фізфак), В. Гарасімаў (гістфак) і Я. Козін (матфак).

**П. ГЕРАСІМОВІЧ,**
**член праўлення спартыўнага клуба БДУ.**



## НЯХАЙ ЖЫВЕ ТРАДЫЦЫЯ!



Традыцыя нарадзілася тры гады таму назад. Тры гады таму назад упершыню наведаў клуб турыстаў-альпіністаў універсітэта Якаў Рыгоравіч Аркін — заслужаны майстар спорту, адзін з вядучых савецкіх альпіністаў. Праз год зноў адбылася сустрэча яго з Беларуссю. На гэты раз разам з Я. Р. Аркіным прыехаў Віталій Міхайлавіч Абалакаў — адзін з ветэранаў савецкага альпінізму. Сустрэча закончылася усеагульным пажаданнем: сустрэцца ў наступным годзе. І вось Я. Р. Аркін зноў госць беларускіх альпіністаў. І зноў— не адзін, а разам з заслужаным майстрам спорту Міхаілам Іванавічам Ануфрыкавым. Госці прысутнічалі на альпінісцкім вечары, дзе дэманстраваліся прывезеныя імі спартыўныя фільмы. На наступны дзень сустрэча працягвалася ў лесе ля пасёлка Гарадзішча. Тут раніцай 8 красавіка быў узнят сцяг чарговага веснавога злёту альпіністаў БДУ.

Як заўсёды, злёт пачаўся з песні:

«...Я не знаю, где
встретиться
Нам придется с тобой...»

Лясная цішыня была парушана яшчэ вечарам, калі запалаў на паляне вялікі касцёр...

Я. Р. Аркін і М. І. Ануфрыкаў — члены «абалакаўскай каманды», мацнейшай альпінісцкай каманды Саюза. Калі дадаць, што яны яшчэ і цікавейшыя субяседнікі, то зразумела, што студэнты слухалі іх расказы з надзвычайнай увагай. Але і за доўгі вечар гасцям немагчыма было расказаць усе цікавыя гісторыі са сваёй альпінісцкай практыкі. Таму на наступны дзень у кожную зручную хвіліну вакол іх вырастаў натоўп, каб паслухаць чарговы расказ...

Спаборніцтвы па пераадоленню паласы перашкод — кульмінацыйны момант кожнага злёту. І — як на кожным злёце — тут былі і смех, і захапленне майстэрствам самых спрытных, і сапраўдны спартыўны азарт. Шлях да перамогі быў нялёгкі...

На развітанне — зноў песня. І маўклівае абяцанне працягваць традыцыю — сустрэцца праз год.

**Т. ЛАЎРЫНОВІЧ.**

## НА ГРАБЯНІ ПЕРАМОГІ

Гэтай сустрэчы чакалі. Да яе рыхтаваліся. І вось перамога— доўгачаканая і заканамерная. Плыўцы зборнай каманды нашага універсітэта пераканаўча выйгралі таварыскую сустрэчу па плаванню ў сваіх сапернікаў і сяброў з Вільнюскага універсітэта і Каунаскага інстытута фізкультуры.

Матч адбыўся ў Вільнюсе. Гэта ўжо другая сустрэча спартсменаў. Першая праходзіла ў сакавіку мінулага года ў Мінску. Візіт у адказ нашых плыўцоў прынёс ім радасць перамогі.

Каманда БДУ выступала дружна. Кожны спартсмен аддаў усе сілы ў спаборніцтве з сапернікамі. Ва ўсіх заплывах ішла вострая барацьба за дзесятыя долі секунды. Так, напрыклад, Уладзімір Зорын, прадстаўнік спортклуба БДУ, літаральна на апошніх метрах вырваўся ўперад і выйграў заплыў на 100 метраў брасам. Ён жа стаў пераможцай і на дыстанцыі 200 метраў комплекснага плавання.

Упэўнена выступала студэнтка II курса геаграфічнага факультэта, майстар спорту Ірына Жураўлёва. Яна была першай у заплыве на 100 метраў вольным стылем і другой на дыстанцыі 200 метраў комплекснага плавання. Проста цудоўна выступала прадстаўніца спортклуба БДУ Наташа Стрыжагодская. У яе актыве дзве пераканаўчыя перамогі ў заплывах на 100 метраў брасам і на спіне. Студэнт II курса фізічнага факультэта Аляксандр Сямёнаў перамог сваіх сапернікаў на дыстанцыі 100 метраў батэрфляем. Некалькі слабей ён праплыў 100 м на спіне, дзе быў толькі трэцім.

Калі поспех беларускіх спартсменаў быў бясспрэчным (яны перамаглі з адрывам у 8 ачкоў), то за другое месца разгарэлася ўпартая барацьба. І можна ўявіць засмучэнне каўнасцаў, калі пры падвядзенні канчатковых вынікаў высветлілася, што яны прайгралі спартсменам з Вільнюса ўсяго адно ачко і занялі III месца. Але, думаецца, асабліва засмучацца спартсменам не варта. Бо сустрэчы паміж плыўцамі трох вну абяцаюць стаць традыцыйнымі, і любая каманда ў будучым мае права разлічваць на званне мацнейшай.

**У. БАРКОЎСКІ.**



Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон — 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Заказ 425. АТ 05174